Ба 216486

VIII.2.
27

VII
26746

ПЯТРО ГЛЕБКА

# ШЫПШЫНА

ЛІРЫКА

УЗВЫШША

А Т

Ба 216486

ПЯТРО ГЛЕБКА

Вел. еддзел
1994 г.

# ШЫПШЫНА

ЛІРЫКА

VII
26746

УЗВЫШША
МЕНСК—1927

1949
ПРОВЕРЕНО

Галоўлітбел № 25748.
2-ая Дзярждрукліт. Зак.
№ 2611. 2.000 экз.

ОДЕССКАЯ ГОСУДАРСТВЕННАЯ
-2-МАР.-1928
Публичн... библиотека

10. 2. 2010

*... І краскі, і словы завіў у вянок,*
*зьвязаў шаўкавіцай-травою;*
*для водару—кветак ня пырскаў віном—*
*крынічнай апырскаў вадою.*

*Ні сябру, ні брату, ні сёстрам сваім*
*і, нават, ні дзеўчыне русай*
*я гэты шаўковы вяночак завіў,—*
*завіў я яго Беларусі.*

29-III—27г.
Менск

О, Беларусь, мая шыпшына,
зялёны ліст, чырвоны цьвет!

**Ул. Дубоўка.**

I

## НЯ МАЕМ МЫ СРЭБРА

Ня маем мы срэбра, караляў,
і скарбы ўсе наскія просты:
з заходу да ўсходу над краем
красы залацістая россып.

З вазёраў, лясоў і палёў,
з багністых, прадоністых нетраў
сабраў гэту россып—золата слоў,
няхай не разьметаюць ветры.

23-III—27 г.
Менск

## БЕЛАРУСЬ

Зімой — сьнягі, мяцеліцы, завеі;
вясною—бурныя паводкі скрозь;
улетку—сумныя напевы жнеяў;
увосень — золкасьці халоднай рось.

Балоты дзікія, вазёры сінія—
Журылася над імі ўвечары зара.
І абзывалі гэтую краіну
„Заходня-рускі край“.

Ды час настаў... Загаманілі нетры,
загаманілі наскія балоты і лясы.
З усходу новага прымчалі ветры
Імклівай радасьці і шчасьця галасы.

Вось з тых часоў пачалі клікаць
краіну наскую іначай—Беларусь.
Мне помніцца вясна... Вясна Вялікая!
Па-над далінамі вясёлкавы абрус.

Ня веру я, ня веру ані ў які лёс,—
хтось выдумаў: краіна за грахі
ліе крывавыя крыніцы сьлёз,
і стогнуць, і пакутуюць браты.

Няпраўда ўсё! Я веру моцна,
што помсты дзень яшчэ настане:
за крыўду горкую, атрутны воцат
адплацім мы—паўстаньнем.

Цяпер над Нёмнам, над бурнай Віслай
узьвіўся стогн ў крывавых плямах,—
а прыдзе дзень—пакуты зьвіснуць
і па зямлі прамчыцца лямант.

Тады над той, забранай, Беларусьсю
узыдзе ясная і новая зара.
Усходу, захаду я тройчы пакланюся—
няхай агні, ня гаснучы, гараць!

Люты 1927 г.
Менск

* * *

Дагарыць мая ціхая радасьць—
пражыць мне прысуджана шмат...
Я сасьніў, што у сонца на градах
зацьвітае ружовы мак.

Хай цьвіце—хоць завянуць пялёсткі,
хай цьвіце—хоць асыплецца ліст...
Мо'сапраўды выпаў лёс такі,
што мне кажуць усе „шовинист."

Часта й тых вінавацяць у блудзе,
хто душою чысьцей за расу...
Хіба думак ці сілы ня будзе,
ці агорне няведамы сум—

дык тады заламлю свае рукі,
(Беларусь ты мая, прабачай!),
а цяпер—я ня ведаю скрухі,
хоць гавораць, хоць крычаць.

І ня веру ніколі у радасьць,
калі шчырасьці там няма...
Беларусь, на тваіх на градах
зацьвіце кармазынавы мак!

14-V—26 г.
Менск

# ЯК РАНЕЙ

Як раней, я ціхі і просты,
толькі іншае сэрцам пасяг:
залатую над клёнамі россып
Беларусі зьбіраю ў пасаг.

Прыбярэцца тады Яна ў строі,
упляце шаўкавіцу ў касу,
выйдзе, стане на ўзгорачку стройна,—
залюбуюцца ўсе на красу.

Залюбуюцца людзі на поступ—
гэта сёньня я сэрцам пасяг—
і таму залацістую россып
Беларусі зьбіраю ў пасаг.

10-VII—26 г.
Вуса

# І КАЛІ ПРЫПАДУ

... І калі прыпаду на траву,
і трава абліецца кроўю,
дык тады ашчапер галаву,
расцалуй пасівелыя бровы.

Клён зялёны, чупрынай махні—
хай лісты рассыпаюцца звонка.
. . . . . . .
Эх, вясна! Залацістыя дні...
Сонца іскры рассыпала вонках!

І пападалі іскры на гай,
І пападалі іскры на поле...
Дык чаму-ж і журба, і туга,
адначасна і радасьць да болю?!

Вось бяроза зялёна-зялёныя
заплятае сабе касьнікі.
Не хачу пасьцілацца лёнам я,
калі нават ня згодзен ні з кім.

Я хачу павярнуць плянэту,
бачыць іншае сонца і зоры...
Кажуць, скора скончэньне сьвету—
што гавораць—няхай гавораць.

Гэты сьлед палажыла пята
тэй мінуўшчыны чорнай і дзікай—
я-ж хачу завіваць, заплятаць
з новых кветак вянок на дзіва.

І калі прыпаду на траву,
і трава абліецца кроўю,
дык тады—ашчапер галаву,
расцалуй пасівелыя бровы!

4-VI—26 г.
Менск

# Я НЕ КАЖУ

Я не кажу, што вечна малады,
і не кажу, што бровы паліняюць:
цьвітуць сады, адцьвітаюць сады,
вось гэта ведаю, вось гэта знаю.

Затым у сэрцы нейкая упартасьць,
а думы шэпчуць песьнямі зарок:
мы самі пабудуем наша Заўтра
на крыжаваньні ўсіх дарог.

Аддам усё на гэта будаваньне,
а трэ‘,—дык пралію і кроў:
каб увайсьці у будучыну—зацьвітаньне,
трэ‘ сэрца ахвяраваць,— ня крок.

Дык не кажу, што вечна малады я,
і не кажу—павісьне галава:
Няхай галёкаюць ня наскія—другія,
а мы упарта будзем будаваць!

Зіма 1926 г.
Менск

## ЗІМА

...І вось зіма. Ірдзельныя абрусы,
як для ўрачыстасьці, пасланы на палёх.
Здаецца сьвет увесь радзімай Беларусьсю,—
так любы мне і Захад і Усход.

Выходжу сьцежкаю, выходжу ў поле;
шляхі прасторныя і клічуць, і завуць.
Здаецца, што й тугі ня ведалі ніколі,
бо думы зорныя нітуюць галаву.

Ідзеш упэўнена—тады і не павалішся...
Палі зацьвітаюць сьнягамі і зарой.
Вось нашы ворагі, а вось—таварышы,
тады 'шчэ больш напорны крок.

Ня нам прапасьці, ня нам загінуць!..
Хай зубы ляскаюць у роспачы ў другіх...
... Сьнягі... зіма... Імкненьні не застыгнуць,
калі сьвет будучы так моцна дарагі.

Няхай асьвяне моладасьць сваім аблічам,
а непакорны дух ня кіне вымагаць,
бо нашых дзён—вякамі не падлічыш,
ня ведаем амягі у нагах.

Выходжу сьцежкаю, выходжу ў поле:
шляхі прасторныя і клічуць і завуць.
Здаецца, што тугі—ня ведалі ніколі,
бо думы зорныя нітуюць галаву.

І вось... зіма. Ірдзельныя абрусы,
як для ўрачыстасьці, пасланы на палёх.
Здаецца сьвет увесь радзімай Беларусьсю,
так любы мне і Захад і Усход.

Зіма 1926 г.
Менск

# НЕ КАЖЫ

Не кажы—не паверу ніколі:
хмары сіняга неба ня засьцяць—
гэта поле, у сьнезе поле,
а у полі—і смутак, і радасьць.

Сам я ведаю, сам я знаю,
скуль прыходзяць туга і радасьць.
Думы думаю, а ў думах гадаю,
што ня трэба ні стынуць, ні падаць.

Мо' таму так і хочацца крыкнуць
ў гэту сьнежную замець і веі:
к чорту роспач, к чорту ўсхліпы,
калі ветры усходнія веюць.

І кажу—не паверу ніколі:
хмары сіняга неба ня засьцяць:
калі сонца ільсьніцца колер,
дык красуе і радасьць, і шчасьце.

Зіма 1927 г.
Менск

225186

## ЗАРА КУПАЕЦЦА

Зара купаецца у сьнежных веях,
трывожыць ціш пранізьлівы гудок;
крамянай шэраньню сады сівеюць,
гляджу што-раніцы, гляджу я на усток.

А ў нас на вуліцы сьляды на сьнезе:
адзін, другі... ці можна іх зьлічыць?
Здаецца клён зацьвіўшым бэзам,
а раньні звон—усплёскам навальніц.

І дух і крок гартуюцца навалай,
таму ад радасьці—у сэрцы шыр...

. . . . . .

Імклівяць дні, за хваляй хваля:
здаецца сьнег—ня сьнег, а жвір.

Жарства калючая у шэрані крывавай...
Прабегла дрож, як электрычны ток...
Замоўк гудок—маўклівая трываласьць,—
гляджу ізноў упарта на усток.

Маўчыць Усход. Чыя-ж там перамога?
Напорна вочы мераюць прасьцяг:
шляхі бязьмежныя, бязьмежныя дарогі,
і людзі йдуць, нясуць чырвоны сьцяг.



Ба 216486

Усе сыходзяцца на ростані дарог:
— за крыўду цяжкую хай Помста пакарае...
Зьвіліся хмары, ударыў гром:
Заміж вясёлкі—зара над краем.

Віецца радасьць і зоры... зоры...

. . . . . . . . . .

Ах, гэта сон? І вось другі гудок
прарочыць сну, што праўдай загаворыць...
Ізноў гляджу, гляджу я на усток.

Зіма 1926 г.
Менск

Ба 216486

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна

Мы дрожим мечтою единственной..

**А. Блок.**

# II

## БЛІЗКІМ І ДАЛЁКІМ

Жыцьцё—гэта песьня, а песьня—жыцьцё,
адгэтуль і смутак, і радасьць.
Адзін свае думы для ўсіх распасьцёр,
а думы ягоныя крадуць.

І хваляцца шчырасьцю крадзеных слоў,
і кідаюць іх на ўзьвівецер;
пялёсткі з шыпшыны зрываюць вясной,—
з калючак вяночкі віеце!

Няхай, мы з калючак вяночак зьвіем,
каралі зьбяром упрыгожыць:
ня ўпусьцім нікому мы скарбы свае,—
шыпшынай задзівіцца кожын.

Браточкі мае, дарагія мае,—
адзіная радасьць і мэта!
Таму мо' і грудзі ня хочуць смылець,
калі вінавацяць поэту.

Было, што за наскае слова,—касьцёр,
а сталася, бачыш, іначай.
Жыцьцё—гэта песньня, а песьня—жыцьцё,
таму і сьмяемся, і плачам.

Зіма 1926 г.
Менск

## ЯКУБУ КОЛАСУ

Ну, што сказаць?
Якімі словамі усьцешыць?
А можа ў глыб вачэй
папросту паглядзець?
Ні слова кволае,
ні лёгкая усьмешка
ня могуць засьціць
вуснаў сьлед.

Браточкі любыя!
Браточкі дарагія!
Ці чулі вы,
як плача раньняя Зара?!
І росы падаюць,
ільсьняцца, гінуць,
а сонца выплыве, —
тады гараць, гараць...

Вось так і Беларусь:
ад краю і да краю
сьлязьмі змачыла
зарослыя шляхі...
Казалі наскія,
што доля пакарала,
а іншыя,
што лёс такі.

Віюцца сёньня песьні,—
Зьвіваўся лямант;
здавалася,
што сьлёзы век ня счануць.
Вазёры і балоты—
мо' гэта плямы
ад сьлёз былых
на пурпурах пясчаных?

Сягоньня сьлёзы ўсе
мы пазьбіралі ў наквецць,
каб край балот
закрасаваў, зацьвіў.
Таму і радасна,
аж да усьмешкі нават,
што росы падаюць
гарэць на жвір.

А вось ці чулі вы,
як плачуць навальніцы,
як стогне бор
і шалясьцяць лясы?
Тады маўчаць
дарогі і гасьцінцы,
а хмары чорныя
выходзяць галасіць.

Тады і ён
выходзіў на дарогу,
каб вартаваць
пясчаныя палі.
Балюча сэрца раніў
кплівы рогат,
што думы ў песьнях
мужыцкіх запаліў.

За што-ж яго
абвінавацілі ў маркоце?!
Ці не затым,
што сёньня весялосьць?
Хай песьня сумная, —
а хто яе заводзіў,
а хто аддаў
для песьні маладосьць?!

Браточкі любыя!
Браточкі дарагія!
Калі навалы б'юць
і крышаць берагі—
ня шмат ідзе
адважных, каб загінуць
за песьню наскую,
за радасьць бяз тугі.

Дык вось таму
асьвянула усьмешка,
дык вось таму
паволі меркне зірк...
Дык што сказаць?
Якімі словамі усьцешыць?
Які вянок
на галаву завіць?

Ня трэба слоў,
ня трэ' пахвальных одаў,—
хай песьня звоніць,
водгульлем зьвініць!
За песьню гэтую
цябе услявяць ўсе народы,
зьвіюць вянок
з калосьсяў і зарніц.

Лістапад 1926 г.
Менск

## М. БАГДАНОВІЧУ

Ці то восень была, ці зіма, ці вясна,
а ці сонца сьвяціла, ці зоры?
Пахіліўся на дол і пагорбіўся стан...
Кіпарысы наўкола і мора.

Хвалі на моры
сумуюць, гавораць:
хто і дзе?
Вецер галосіць,
чорная просінь
на вадзе.

Ня цьвілі васількі, а кізілы цьвілі,
калі жвір на труну ўссыпалі.
Скаргі скрозь праляглі на пясчанай зямлі,
толькі бурна імкнуліся хвалі.

Хвалі на моры
сумуюць, гавораць:
хтосьці зьнік.
Людзі прыпалі,
на стромкія скалы
палі ніц.

Ці стаяў, а ці не над магілаю крыж,
толькі помнік стаіць на узвышшы.
Не зязюля, а чайкі узьвеялі крык,
узьняліся над морам і вышай...

Хвалі на моры
сумуюць, гавораць;
скрозь—туман:
хтось на чужыне
з песьняй загінуў
і... няма.

Спавіла яго сьмерць, але песьня жыве—
хіба песьня калі бо загіне?!
Да магілы сьляды на зялёнай траве,
быццам шлях на вазёрах на сініх...

Хвалі на моры
сумуюць, гавораць:
коцяць жвір.
Вэлюм на вочы...
Хвалі прарочаць:
ён— жывы!

8-III—27 г.
Менск

## МАКСІМУ ЛУЖАНІНУ

Браточак мой і дружа дарагі,
за што балюча сэрца дакараеш?
Ці-ж я поэзіі адводжу берагі
альбо зару тушу над краем?

Няхай зара гарыць, ня меркне і ня гасьне,—
краіну не спавіе туман!
Я сам-бы меў за радасьць і за шчасьце
сьпяваць пра любую, ды любае няма.

Ня думай ты—я не пазайздросьціў
і ня ўпікнуў, што пішаш пра дзяўчат:
люблю у песьні шчырасьць, простасьць,
вясёлы сьмех у маладых вачах.

Няхай гавораць—дзяўчаты згуба
і трацяць моладасьць калосьсямі у полі,
Нашто-ж халодныя цалуюць губы
і праклінаюць іх халодны погляд?!

Адным узрадаван, адным усьцешан,
што песьню ёй калісь злажыў...
Няхай яна мо' выдумка, насьмешка—
усё-ж лягчэй сьпяваць і жыць.

Няма цяпер маўклівай кволасьці:
люблю у слове звон і шыр.
Гарыць душа аб будучыне полымем,
а песьня—толькі бляск душы.

Цябе не вінавачу і не дакараю,
а зайздрасьці і ў думках не нашу:
калі яна табе так моцна дарагая—
аддай усё—і песьню і душу.

І пойдзеце тады да мэты разам,
каб будаваць народу лёс,
і больш ня вернуцца былыя перагасы
з крыніцамі дзявочых сьлёз.

Мо' зьвінавацяць ў здрадзе да краіны—
упарта сочым мы зару...
Праз вобраз любае, чарнявае дзяўчыны
ты апяваеш нашу Беларусь.

Дык, браце мой, таварыш дарагі,
за што балюча сэрца дакараеш?
Ці-ж я поэзіі адвожу берагі
альбо зару тушу над краем?

Няхай зара гарыць, ня меркне і ня гасьне—
даволі край ахутваў туман!
Я сам-бы меў за радасьць і за шчасьце
сьпяваць пра любую, ды любае няма.

22-XI—26 г.
Менск

Oczy—a w oczach i straszno i miękko,
Oczy—niedobre, aksamitne, duże.

Władysław Bronewski.

III

# НЯ ДУМАЎ НІКОЛІ

Ня думаў ніколі, што вочы прадоньне,
хоць гляне яна маладая:
казаў што учора, ня выкажу сёньня—
бо сёньня ёй песьні складаю.

Прайшла, толькі строі далёка шасьцяць,
усьмешку на вуснах стаіла,
а гэта усьмешка, усьмешка жыцьця—
чароўная дзікая сіла.

Ці зірк, а ці зоры упалі на ніз,
саткалі узор бавальніцай?
Глядзець, ці упасьці з радасьцю ніц—
прыгожасьці тэй пакланіцца.

Ці хмары, ці косы, ці можа туман
над рэчкаю ветры гайдаюць?
Казаў 'шчэ учора, што любай няма,—
сягоньня ёй песьні складаю—
ня думаў ніколі, што вочы прадоньне.

25-XI—26 г.
Менск

## ВОЧЫ СІНІЯ

Васількова, сінія вочы,
не спазнаць таямніц вашых дум!
Маладую сасну ветры точаць,
малады засыхае дуб.

Дык таму, мусіць, сэрца зьнямела,—
зірк вачэй для мяне—прадоньне.
Стрэў на пожні яе з тварам белым,
стрэў і сьціснуў далонямі скроні.

З тых часоў у маіх вандраваньнях
сэрца сочыць блакіты вачэй,
ад таго і у слоў барваваньні
сіні колер заўсёды званчэй.

Я ня першы ў гады маладыя,
калі сэрца крыніцай плюскоча,
засьпяваў пра блакітныя тыя,
задуменныя, ціхія вочы.

Не шкадую былога маленства:
адцьвітуць усё роўна сады.
Ці на сьцежках, ці на гасьцінцах—
толькі раз чалавек малады.

23-XII—25 г.
Менск

# АХ, НЕ

Ах, не!..
Сваёю простаю усьмешкай
табе ня кратаць сэрца, дум:
мяне ў жыцьці другое цешыць,
інакшай сьцежкаю іду.

Магчыма ты забудзешся на крыўду,
калі пачну я ростань цалаваць:
далёкія і блізкія ня прыдуць,
а станеш ты адна у галавах.

Адна мо' ты абложыш і магілу,
рассыплеш кветкі белыя на жвір...
Чамусьці ўсё-ж няведамая сіла
чаруе, горне зорны зірк

да іншых дум, да іншых лятуценьняў,
дзе мо' і ласкі, як твая, няма,
а ёсьць адвага у імкненьнях,
а для імкненьняў ёсьць размах.

І вось, калі прасочыцца у жылы
адвага гэтая, як сонца да ліста,—
тады не зарасьце мая магіла:
шыпшына будзе расьцьвітаць.

Дык вось чаму сваёй усьмешкай
табе ня кратаць сэрца, дум...
Мяне ў жыцьці другое цешыць,
шляхамі іншымі іду.

Восень 1926 г.
Менск

# ГНУЦЦА ВЕРБЫ

Гнуцца вербы,
гнуцца нізка,
гнуцца аж да долу...
Дарагая, сядзь-жа блізка,
раскажы пра долю.

Я вачэй тваіх праменьні
пад нябесны колер
расцалую,
можа меней
будзе ў сэрцы болю.

Гнуцца вербы,
гнуцца ніжай,
гнуцца аж да долу.
Дарагая, сядзь-жа бліжай,
раскажы пра долю.

Вясна 1926 г.
Менск

## ТЫ РАСЛА

Ты расла, гадавалася ў горы,
пралівала крыніцы сьлёз,
і пайшла ад пятнаццаці ў горад
пашукаць сваю долю і лёс.

Не чакаў, калі бачыў калісьці
каля постаці сьпелага жыта,
што рассыплеш свой зірк шалясьцісты
на пясок, на гасьцінец пабіты.

Дзе з вачэй тваіх дзеліся зоры?
Як-жа з вуснаў прапала усьмешка?..
Ты, дзяўчынка, маўчыш, не гаворыш,
ці сябе, а ці іншых цешыш...

6-VII—26 г.
Вуса

## ЗАПАЛІЛІ АГНІ

Запалілі агні, пасьцілаецца сьцень,
пасьцілаецца сьцень на асфальты.
Зазьвінела рояль, звон калышацца дзесь,
звон калышацца дзесь, быццам хвалі.

Пападае у вір і зьнікае акорд,
і зьнікае акорд, быццам мары,
толькі горад шуміць пад усьмешкамі зор,
пад усьмешкамі зор—чыстых чараў.

Ты выходзіш тады, сустракаеш свой дзень,
сустракаеш свой дзень ты увечар.
Запалілі агні, пасьцілаецца сьцень,
пасьцілаецца сьцень чалавечы.

21-IV—27 г.
Менск

# Я ЧАСТА ДУМАЮ

Я часта думаю, а думкамі гадаю,
за што халодным поглядам карыш?
Ці-ж ты ня ведала, дзяўчынка маладая,
што страціш сэрца—радасьць дагарыць?

Спаткаў цябе, як і ўсялякую другую,
спаткаў увечары вясною ля ракі,
там вербы гольлямі зямлю цалуюць,
а хвалі б'юць імкліва ў берагі.

Падаў табе руку для шчасьця,
каб разам сьвет агнямі запаліць.
Я не паверу, што хмары неба засьцяць,
калі калосьсямі красуюцца палі.

Чаму і дзе ты страціла таварышаў,
а любым стаў усякі „дарагі"?
Халоднай радасьцю навошта хвалішся,
калі яна асьвяне, дагарыць?

І зараз вочы на штосьці скардзяцца,
а сьлёзы падаюць сьняжынкамі на дол...
Скажы... Скажы... ці-ж то ад радасьці
стаіла ты у вочах боль?

Падаў тады руку для шчасьця,
цяпер для радасьці хачу падаць.
Калі пялёсткі з яблыні ня думаюць упасьці,
дык радасьці ня вернеш больш назад.

Пялёсткі сыплюцца, пялёсткі ападаюць,
каб новым колерам вясною красаваць,—
дык радасьць вернецца, дзяўчынка маладая,
няхай ня падае маўклівая галава.

Няхай у роспачы душа не халадзее;
ня трэба поглядам пагардлівым карыць:
шляхі ў нас ёсьць, дык адшукай надзею,
і радасьці ціхая твая не дагарыць.

Зіма 1926 г.
Менск

## ЗАЦЬВІЛІ ЗАРНІЦЫ

Зацьвілі зарніцы, зацьвілі над гаем...
Думае дзяўчынка, думае-гадае:

— У палёх дарогі, у палёх сьцяжынкі;
— падаюць на скроні, падаюць сьняжынкі...

— Дзе ты мая радасьць, дзе ты мая наквець?..—
Заламала рукі, заламала накрыж.

Ах, навошта сьлёзы, ах, навошта роспач,—
засьпявай, дзяўчынка, засьпявай папросту.

Наскія дарогі, наскія пуціны
у пяскох ня зьнікнуць, у пяскох ня згінуць.

Зацьвілі зарніцы, зацьвілі сузор'ем,
звоняць над нізінай, звоняць над узгор'ем.

Паглядзі на зоры, паглядзі над краем,—
знойдзеш сваю сьцежку, знойдзеш, дарагая!

Зіма 1926 г.
Менск

## ВЯНЕ УСЬМЕШКА

Вяне усьмешка на вуснах,
русая жоўкне каса,
ў сэрцы самота і вусьціш...
Ведаю боль,—што казаць.

Сам перажыў гэту здраду,—
словы спагады лавіў:
плакаў за нечую радасьць,
ласку чужую хваліў.

Плакаў, а сонцу ўсьміхаўся,
ткаў з яго кос паясы,—
думка высока ўзьвілася...
Толькі ня трэ' галасіць!

Плюнь на спагаду і здраду,
сьлёзы зьбяры у прыпол,—
знойдзеш і ласку і радасьць,
лістам ня ляжаш на дол.

Ведаю—сэрцу што горна:
русая жоўкне каса,—
плюнь на спагаду пакорных,
плюнь, ня зірнуўшы назад!

22-VII—26 г.
Менск

## НЕ МАЎЧЫ

Не маўчы—засьпявай хоць „Каліну“,
не зважай на яе ты міноры:
у журлівых тугі пераборах
выпей жальбу, мая ты дзяўчына!

Не маўчы—моўчкі сэрца ные,
і ня плач—сьлёзы гора змываюць,
але разам, бы жвір, тыя хвалі,
прыгажосьць тваю ясную змыюць.

Будзеш плакаць—затуманяцца вочы,
васільковы зьлiняе блакіт,
будзеш, зорка мая, галасіць—
чуў я скаргі ня раз і ня двойчы.

Толькі ў песьні, мая ты дзяўчына,
захлынецца і жальба і гора,
загарацца зноў вочы, як зоры,—
не маўчы—засьпявай хоць „Каліну“.

3-VI—1926 г.
Вуса

# СПАТКАЕМ ВЯСНУ

Ноч туманная. Ціха і золка.
Мусіць, скора настане вясна.
Ці ты прыдзеш, мая комсамолка,
а ці будзеш адна?

Лепш прыдзі на дарогу у поле,
лепш прыдзі—мы спаткаем вясну...
Штосьці сэрца трывожыць і коле,—
а ці радасьць, ці можа сум?

Скуль-жа сум, калі радасьць на вуснах
і усьмешка на сініх вачах?
Струны звонкія плачуць на гусьлях
пра нядолю і долю дзяўчат.

Веру я маладосьці і шчасьцю:
ты ў нядолі ня будзеш жыць.
Нам ня згінуць, нам не прапасьці,
нам ня ведаць гаркоты, імжы!

Не заломіш у роспачы рукі,
і сама пабудуеш лёс.
Дык чаму-ж і балючасьць і скруха
ў зацьвітаньні бялявых бяроз.

Значыць, зноў запляла свае косы
чорна-сінія белаю стужкаю.
На туманы, на золкія росы
кінь тугу—няхай ветры гушкаюць.

Ты-ж казала калісьці увечар,
што ня будзе ў жыцьці перагас,
а цяпер—долу хіляцца плечы,
ня выходзіш вясны сустракаць.

Выйдзі ты на дарогу у поле,
паразьвей у туманах свой сум,
і ня будзе тужлівага болю—
мы спаткаем вясну.

8-III—1927 г.
Менск

# НАШТО ЗАХАВАЛА

Нашто захавала у сэрцы тугу,
ці радасьці можа няма?
Глянь—вунь трава шалясьціць на лугу,
а ўчора зьвіваўся туман—
зьвіваўся туман.

Бывае маркота, жалоба і сум,—
я зьведаў такія навалы,
а ўсё-ж маладосьці шчасьлівай вясну
навотлю ня кінуў на хвалі—
ня кінуў на хвалі.

Бяз суму і радасьць ярчэй не гарыць,
а роспачы, плачу—ня трэба!
Маўклівая хвоя стаіць на гары,
стаіць і глядзіцца у неба—
глядзіцца у неба.

У будучнасьць глянь, у мінулае глянь,—
(імкнуцца, імкнуліся людзі),
тады ты ня станеш, як белая здань,
і плачу ніколі ня будзе—
ніколі ня будзе!

2-IV—27 г.
Менск

## ДЗЯЎЧЫНА

Схіліўся вечар над калінай,
каліна зьвісла над вадой:
лісты палошча ў ветравіньні,
лісты сінеюць пад імглой.

І доўга, доўга пад калінай
бялела постаць, як туман.
Каго чакаеш ты, дзяўчына?—
вятры гавораць, што няма.

Няма!—зашастаў вецер лісьцем,
каліна зноўку над вадой...
— Ты-ж, любы, кляўся мне калісьці
змаганьнем вечным, барацьбой...

І я клянуся ў гэты вечар
таму, жыцьця хто не прадаў...

. . . . . . . . . . . .

Вада цалуе белы плечы,
хавае дзеўчыну вада.

Зіма 1925 г.
Менск

## СЁНЬНЯ Я ЎСПОМНІЎ

Сёньня я ўспомніў той вечар—
зоры трымцелі ў прасторах,
коні ірзалі ў зарэччы,
змрокам закрыліся горы.

Месяц купаўся у зыбкай
боязі сіняй ракі,
вецер гарэзьлівым згібам
песьціў лістоту ракіт.

Там, дзе спляліся бярозы
шоўкам расплеценых кос,
падалі звонкія росы,
шастаў пасьпелы авёс.

Вусны пад колер брусьніцы,
стальлю—блакіты вачэй...
Любая, вобраз твой сьніцца,
сьніцца, і сэрцу лягчэй.

Не, ня учуюць мой лямант—
сьцісну далонямі скронь.
Чымсь ў беларускай сялянкі,
сіньшых вачэй няма скрозь.

Зіма 1925 г.
Менск

...Слова безнадійні, а життя—проспект...

**Володимир Гадзінський**

# IV

## ДАРАГІЯ МАЕ

Дарагія мае, дарагія,
паглядзеце папросту у вочы,
бо ўжо заўтра дарогі другія
хто сьлязьмі, а хто песьняй аточыць.

А здаецца нядаўна, бы ўчора,
залатая была тады восень,
і дрыжалі, дрыжалі зоры,
асыпаліся сьпелым калосьсем.

Асыпалася лісьце у ветрах,
а вятры яго несьлі далёка.
Вось чаму мне хацелася верыць
ў хараство, што ня бачыла вока.

Мы спаткаліся ў гэтую восень,
быццам сьмех, цярусіўся дождж.
. . . . . . . . . . . . . . .
Адцьвілі залацістыя косы,
маладосьць ты мая, маладосьць!

Шчэ нядаўна, як быццам учора,
любаваўся блакітам вачэй,
а каса, аж да сіняга чорная
засьнявала асмугласьць плячэй.

А цяпер галава адцьвітае
і усьмешкі вясёлай няма.
Жаўталісьцямі дні дагараюць
і зямлю засьцілае туман.

Ночы гэтыя цёмна-асеньнія
навяваюць вятрамі тугу...
А сапраўды, якое вясельле,
калі брата кладуць у труну?

Дарагое з усьмешкай аблічча,
я дарую за ласкі табе,
толькі вусны хай болей ня клічуць
ў гэтай страшнай, асеньняй журбе.

Няхай вецер жалобай ня сьвішча,
не шасьціць у кляновым гальлі,
бо вось гэта пажоўклае лісьце
шэпча мне, што калісьці любіў.

Можа так, але зараз другое:
бачыш восень – гаі адцьвілі,
і апрыкрала шмат дарагога,
быццам жоўкласьць асеньняя ліп.

І здаецца, што дзесьці далёка
зацьвітае шыпшына зімой,
а у нас на радзімых балотах
расьцілаецца ў шэрані мох.

Дык таму я гатоў валацугай
у далёкія мкнуцца краі,
каб і ты, Беларусь, па-над лугам
апранула зарніцы страі.

Будзе раніца, белая раніца,
замігаюць сьняжынкі, спадуць,—
мо' ня думы, дык сэрца параняць,
да ваколіц сваіх ня прыду.

Маладосьць тады толькі прысьніцца
і дзяўчыны асмуглай рука,
што калісь абняла над крыніцай,
будзе гнеўна нажом наракаць.

Але ўсё-ж разьвітаемся хіба?!
Хай імкненьні ня гаснуць, ня гінуць,
бо бяз радасьці—лепей пагібель,
дарагія мае, дарагія!

Верасень, 1926 г.
Менск

# МЕСЯЦ НУРЦУЕ

Месяц нурцуе ў бяздоньні
ціхай узрочыстай сіні,
можа і ён—бяздомнік—
кельлі нябеснай схімнік.

Бачыў я часта ў маленстве
толькі цяпер узяў толк:
люба яму пры гасьцінцы
песьціць бярозавы шоўк.

Я—што і месяц—бяздомны:
дзе і калі прытулюся?
Гэта, хоць можа, ўсё роўна,—
я-ж бы хацеў ў Беларусі.

Там, дзе над возерам сінім,
сіньшым за колер нябёс,
зоры губляюцца, гінуць
ў шоўку зацьвіўшых бяроз.

12-V—26 г.
Менск

## НЕ СПАЗНАЛІ МЯНЕ

Не спазналі мяне—валацугу
ні суседзі, ні родная маці:
перайшоў адзінока лугам
і ня вышаў ніхто сустракаці.

Мо' забыліся ўсе, што жывы я,
толькі я на усіх не забыўся.
Вось і клёны, і вербы крывыя—
я за іх на чужыне маліўся.

Праўда, усё зьмяніла свой колер,
і вярба пад акном пасівела,
толькі поле, радзімае поле
ўсё такое-ж шаўковіста-белае.

Толькі неба празрыста-сіняе
і з усьмешкай ранейшаю зор.
Шмат загінула, шмат загіне,—
поле й неба ня зьменяць узор.

13-V—26 г.
Вуса

## РАСЬЦЬВІТАЙ

Расьцьвітай, мая шыпшына,
разьвівайся без мяне,
з тваіх кветак мо' дзяўчына
для мяне вянок зьвіе.

Я прыеду тады ўвосень—
не завяне цьвет-вянок
так, як вяне чорных косаў
на плячох нязьвіты шоўк.

Папрашу дзяўчыну шчыра,
хай узложыць мне вянок.
. . . . . . . . . . .
На палі прыду чужыя,
капнуць сьлёзы на пясок!

Не для сівых кос дзяўчына
залаты віла вянок.
Адцьвітай, мая шыпшына,—
зацьвітай сыры пясок!

Вясна 1926 г.
Вуса

# ВЕЕ ВЕЦЕР

Вее вецер—лёгкі подых,
на дарозе сьнежны пыл.
Перажытага—ня шкода,—
маладым-бы толькі быць.

Зьберагчы ня ўмелі вочы
цьвет іскрысты, залаты.
Помню тонкі стан дзявочы...
і .. зялёныя сады...

Помню вечар... Ах, і вечар!..
Сэрцу й сёньня не астыць:
русы косы, белы плечы,
вочы з зіркам залатым...

Вусны палкія—маліны...
Што было—таго ня знаць:
сьведкі немыя, дзяўчынка,—
што-ж раскажа белы сад?!

Дык таму я хмуру бровы,—
восень, ветры, сьнег і дождж...
Эх, лясы мае, дубровы,
знаць і вам каханьня досьць.

І са шчок ірдзень спадае,
вяне ўсьмешка на губах...
Весялосьць дзе-ж маладая?..
Саду бэзавага пах?!

17-X—25 г.
Менск

# НЯ КУВАЙ, ЗЯЗЮЛЯ

Ня кувай, зязюля, ня кувай два разы;
бо параніш думы,—сэрца апаразіш.

Без тваіх здагадак, без тваіх казаньняў,
агартае душу смутак адцьвітаньня.

Бо здаецца сэрцу, бо здаецца часта,
што і я сягоньня дажываю шчасьце.

Толькі думы шэпчуць, толькі думы кажуць,
што жыцьцё у песьнях далавах ня зьляжа.

І ліюцца песьні, і ліюцца словы,
хоць і ные сэрца—ня хмурнеюць бровы.

Ня кувай, зязюля, ня кувай два разы:
бо і думы раніш,—сэрца апаразіш.

16-VII—26 г.
Вуса

## Я ХАЦЕЎ-БЫ

Я хацеў-бы рассыпаць прасторам
беларускіх маўклівых палёў
радасьць ціхую шоўкавых зораў
і вяночкі узрочыстых слоў.

Не мая толькі гэта доля
ціха пець, а ня ў роспачы выць:
дацьвіла мая радасьць у полі
ў зыбкіх хвалях аўса і травы.

Толькі веру, што прыдзе—і скора
'шчэ няведамы лірнік дасюль;
засьпявае—пасыплюцца зоры,
і далёка пракоціцца гул.

25-IV—26 г.
Вуса

## ГАЙ МОЙ СІНІ

Гай мой сіні, шумі!.. Шумі...
Гэты шум мне у сэрца уліп,
дык няхай хоць кароткі міг
зацьвіце белай радасьцю ліп.

Зацьвіце, бы жыцьцё кармазынам,
я й жыцьцё палюбіў, быццам шум,
а усё-ж і дагэтуль асінам
прызнаюся, што сочыцца сум.

Знаю—жыць не адно,—існаваць:
жыць—патрэбны і песьні і думы,
а як толькі пачну іх снаваць,
дык і радасьць зьмяняецца сумам.

Гай мой сіні, шумі!.. Шумі...
Толькі й люб шурпаваты твой шум,
дык няхай белай радасьці міг
завіецца ў вянок маіх дум.

20-VII—26 г.
Вуса

## ТРЫПЦІХ

### I

Адцьвілі ў барваваньні сады,
забялелі вятры у пялёстках.
Пашарэў, як над хатамі дым,
у душы кармазынавы росквіт.

Забялелі вятры у пялёстках...
Пажаўцеў, бы увосень трава,
у душы кармазынавы росквіт,
і жаданьні ляглі далавах.

Пажаўцеў, бы увосень трава,
дум мурожных квяцісты вянок,
і жаданьні ляглі далавах,—
значыць, шлях загубіў у пяскох.

II

Не сагнуць маладосьць маю ветры,
хоць наземяць пялёсткі сады,
і журба захлынецца у нетрах—
буду зноў, як калісь, маладым.

Хоць наземяць пялёсткі сады,—
зацьвіце мая радасьць—шыпшына,
буду зноў, як калісь, маладым,
бо ніхто яшчэ з песьняй ня згінуў.

Зацьвіце мая радасьць—шыпшына,
вецер пах у палёх разьнясе,
бо ніхто яшчэ з песьняй ня згінуў,
не адзін—хто маліўся красе.

III

Я пайду ў паплавы ды мурожныя,
разьнясе вецер песенны звон.
Ў сіні вечар на жытневай пожні
прыгалублю дзяўчынку ізноў.

Разьнясе вецер песенны звон,
у дуброве адклікнуцца жнеі.
Прыгалублю дзяўчынку ізноў
і журбы тады будзе ўжо меней.

У дуброве адклікнуцца жнеі,
засьпяваюць бяздонныя нетры,
і журбы тады будзе ўжо меней—
не сагнуць маладосьць маю ветры!

Сьнежань 1925 г.
Менск

Werd, ich zum Augenblicke sagen:
Verweile doch! Du bist so schön!..

**Goethe**

# V

## Я НЕ ЧАКАЎ

Я не чакаў, каб гэтых клёнаў шоўк,
што быў вясной зялёна-сіні,
завяў, асмужыўся, пажоўк
і згінуў марна ў ветравіньні.

Ну, што-ж?.. Няхай!—я не шкадую:
я жду вясны—клён зацьвіце.
Вось бачыў я красу другую—
дзяўчыны косы чорныя, што цень.

Няўжо яны завянуць, паліняюць,—
як белы сьнег, растане смоль?..
І сам ня ведаю, і сам ня знаю
ці радасьць сочыцца, ці боль.

Адно спазнаў, што нават рэволюцыя
пакуль ня здужае зьмяніць падзей:
сягоньня клён—гальлё калючае,
а заўтра зноў—цьвіце.

А ты, ўладар зямлі і неба,
імя якому—чалавек,
аплачаш моладасьць аднойчы каля вербаў
і посьле рад зацьвітаньню ў траве.

Нашто туга? Навошта роспач?
Нурцуй глыбей, глыбей у вір:
хай маладосьць—хвіліна проста,
дык кожны міг жыцьця лаві.

Лета 1926 г.
Вуса

## ДРЫЖАЦЬ У ШЭРАНІ

Дрыжаць у шэрані бярозы,
бялеюць сьнежныя палі.
Зімы вясёлкавая россып
убрала срэбрам тапалі.

Трымціцца сонца на завеях,
і гурбы сьнегу да вакон.—
А я пайду, дзе ветры веюць—
імклівых дум рассыплю звон.

Палі маўчаць у белым сьнезе...
Каму я радасьць панясу?
Вясною можа на начлезе
я запляту яе ў касу.

Люблю вясну, зіму, завеі—
жывём у гэтакі мы час:
жыцьцё вясною пунсавее,
зімою радасьць на вачах.

Сьнежань 1925 г.
Менск

## ШТО СКАЗАЦЬ

Што сказаць у словах, што сказаць у песьні,
што сказаць, каб радасьць не ўтаіць?
Зацьвіла краіна, зацьвіла прадвесьнем,
зацьвіла дарога з Крыму да тайгі.

Зіхаціць так сонца, зіхаціць вясною,
зіхаціць і сыпле іскры на палі...
Павалілі ветры, павалілі хвою,
павалілі хвою,—дуба не зваліць!

Дзе ты навальніца, дзе ты запрапала,
дзе ты навальніца?—скалыхні зямлю!
Хмары над сусьветам, хмары і навалы,
хмары на усходзе, сонейка люблю.

Што сказаць у песьні, што сказаць у словах,
што сказаць да сонца, месяца і зор?
Скалыхніся, хмара, скалыхніся, волат,
скалыхніся—нетры параўнуй да гор!

Зацьвіла краіна, зацьвіла прадвесьнем,
зацьвіла дарога з Крыму да тайгі.
Зазьвініць хай сэрца, зазьвініць хай песьня,
зазьвініць сусьвету,—радасьць не ўтаіць!

15-III—27 г.
Менск

## ТЫ ВЯСНА

Ты вясна—маладая красуня,
хіба я не такі малады?
Сэрца радасьцю ціхай красуе,
а у цьвеце красуюць сады.

Зеляненюць на сонцы узгоркі
і сіней за нябёсы рака.
Ой, дзяўчаткі мае комсамолкі,
выйдзем разам вясну сустракаць.

Засьпявайце вясновую песьню,
я вам буду і сам падпяваць.
Сонца косы шаўковыя песьціць,
на узьмежку ўзыходзіць трава.

Ты вясна—маладая красуня,
прыгажэй за усіх за дзяўчат:
галава буйным цьветам красуе,
зацьвілі васількі у вачах.

Вясна 1926 г.
Менск

## ЗАШАЛЯСЬЦЕЛА

Зашалясьцела ў лісьці клёнаў,
зашалясьцела звонам серабра...
І з ветлаю падзякаю-паклонам
схілілася над рэчкаю вярба.

Так думы, быццам з хмары дождж,
ліюцца песьняю на ціхія сады...
А хто так ветліва успомніць нашу маладосьць,
каб быць самому маладым?

10-VII—26 г.
Вуса

# КЛЁН ЗАВЯУ

Клён завяў ды стаіць у раздум'і,
галаву апусьціўшы у дол:
паляцелі лісты, быццам думы,
паляцелі зямлі на прыпол.

Я і сам прыціхаю пад клёнам:
паляцець залатым-бы лісьцём
ды упасьці далёка... з паклонам
перад новай красой і жыцьцём.

Я іду, і лісты адлятаюць;
і чамусьці хмурнее мой твар:
здэцца-б сэрца аддаў разьвітаньню—
у няведамым шмат хараства.

18-VII—26 г.
Вуса

## АХ, НЯ ЛІСЬЦЕ

Ах, ня лісьце, ня лісьце шастае,
быццам золата русых кос,—
гэта россып асеньняя, частая
прасачылася ў сэрца наскрозь.

Дзень учора быў волкі і мокры,
ліст кляновы апаў і прамок,
толькі сэрца маё не прамокла,
хоць і кволіўся сіні змрок.

За вакном чую шэлест асеньні—
значыць, падае, падае ліст...
І гайдаюцца, сьцелюцца сьцені,
дзіка совы заводзяць сьвіст.

Значыць — лісьце, лісьце шастае,
быццам золата русых кос...
Гэта восені радасьць і шчасьце
прасачылася ў сэрца наскрозь:

ці-ж ня знаю, што клён зацьвітае,
што рабіна затым і гарыць,
каб вясною блакітнаму маю
шэлест сіня-зялёны дарыць.

Восень 1926 г.
Менск

## І ЗОРЫ, І МЕСЯЦ...

І зоры, і месяц, і сінь над палямі
вячыста ня моўкнуць—шасьцяць,
а думкі віюць, разьвіваюць памалу

Вялікую Песьню Жыцьця.
Над морам, над лесам, над дзікаю стромай
узьвеяла сонца свой Сьцяг,

яго шаўкавістыя, дзіўныя строі
у ветрах вякоў шалясьцяць.
Загэтым сугучнасьць такая і стройнасьць,

загэтым у цьвеце зямля,
а мы сваю радасьць на стужкі пакроім,
каб выслаць кілімамі шлях.

1/IV—27 г.
Менск

## МЫ ВЕЧНА ІМКНЁМСЯ

Мы вечна імкнёмся да зораў, у высь,
прыходзім, а думка ўсё далей імкнецца,
і добра, што шчасьця ніяк не злавіць,—
бо радасьць пры шчасьці ня радуе сэрца.

30-III—27 г.
Менск

225186
~~336377~~

# ЗЬМЕСТ


Стар.

І краскі, і словы . . . . . . 3

I.

Ня маем мы срэбра . . . . . 7
Беларусь . . . . . . 8
*** Дагарыць мая ціхая радасьць . . . 10
Як раней . . . . . . . 11
І калі прыпаду . . . . . . 12
Я не кажу . . . . . . . 14
Зіма . . . . . . . 15
Не кажы . . . . . . . 17
Зара купаецца . . . . . . 18

II.

Блізкім і далёкім . . . . . . 23
Якубу Коласу . . . . . . 24
М. Багдановічу . . . . . . 27
М. Лужаніну . . . . . . 29

III.

Ня думаў ніколі . . . . . . 33
Вочы сінія . . . . . . 34
Ах, не! . . . . . . . 35
Гнуцца вербы . . . . . . 37
Ты расла . . . . . . . 38
Запалілі агні . . . . . . 39
Я часта думаю . . . . . . 40
Зацьвілі зарніцы . . . . . 42
Вяне усьмешка . . . . . . 43

Не маўчы . . . . . . . . 44
Спаткаем вясну . . . . . . 45
Нашто захавала . . . . . . 47
Дзяўчына . . . . . . . 48
Сёньня я ўспомніў. . . . . . 49

IV.

Дарагія мае . . . . . . 53
Месяц нурцуе . . . . . . 56
Не спазналі мяне . . . . . 57
Расьцьвітай. . . . . . . 58
Вее вецер . . . . . . . 59
Ня кувай, зязюля . . . . . 60
Я хацеў-бы . . . . . . 61
Гай мой сіні . . . . . . 62
Трыпціх . . . . . . . 63

V.

Я не чакаў. . . . . . . 69
Дрыжаць у шэрані . . . . . 70
Што сказаць . . . . . . 71
Ты вясна . . . . . . . 72
Зашалясьцела . . . . . . 73
Клён завяў . . . . . . . 74
Ах, ня лісьце. . . . . . 75
І зоры, і месяц . . . . . 76
Мы вечна імкнёмся . . . . . 77

Дзяржаўная
бібліятэка БССР
імя У. І. Леніна

671

ВИ000004033756

~~ЦАНА 50 кап.~~

Вол. гадзел
1994 г.

30 г.